ПАГЛЫБЛЕННЕ ў традыцыю
10.09.2013
Чаму не варта забываць пра сваю культурную спадчыну

Для таго, каб размаўляць пра захаванне этна-культурнай спадчыны нават і нагода спецыяльная не патрэбна. Здаецца, для беларусаў гэтая тэма заўжды актуальная. Варта толькі выйсці на вуліцу ды паслухаць, на якой мове людзі размаўляюць.

Што ўжо казаць пра традыцыйную музыку, адзенне, наогул мастацтва.

Вячаслаў КАЛАЦЭЙ, лідар постфольк-гурта «Ветах», а таксама загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, расказаў пра адну сенсацыйную знаходку, беларускія этна-фестывалі ды нашых спевакоў узроўню Шаляпіна. А таксама паразважаў пра тое, чаму на беларускай культуры пакуль так і не навучыліся зарабляць, як выхаваць новае пакаленне сапраўдных беларусаў і вярнуць дуду ў побытавы ўжытак.



Ёсць Фестывалі…

Што такое этнічная музыка? Гэта музыка, перанятая вусным шляхам (без нот) ад «майстра» — носьбіта традыцыі. У этнамузыцы важная сувязь з мясцовай традыцыяй, стыль і манера, тым больш што на Беларусі аўтэнтычны фальклор захаваўся ў фоназапісах, відэафільмах і часам яшчэ ў жывым бытаванні. Некаторыя з нас слухалі легендарных Сцяпана Дубейку і Ганну Вянгуру, шмат хто яшчэ пачуе Міхася Басякова. Гэта — спевакі ўзроўню Шаляпіна. Яны — самародкі і прадстаўнікі буйной і віртуознай школы беларускіх этнаспеваў, і нам вельмі пашанцавала, што іх галасы былі зафіксаваны аўдыявізуальным антраполагам Зінаідай Мажэйкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйная музыка — гэта асобная культура: каб яе асэнсаваць і далучыцца да яе, трэба прыкласці пэўныя намаганні і патраціць пэўны час, які ў сучаснага чалавека не заўсёды ёсць. Можна хуценька надзець народны строй, узяць інструменты і сказаць, што я — пераемнік фальклору. Але гэта толькі першы крок.

У Беларусі недастаткова фестываляў, прысвечаных традыцыйнай культуры. У той жа Літве, напрыклад, каля 100 этнафестываляў, якія ладзіць іх камісія ЮНЕСКА. А ў нас нават няма спецыяльных фестываляў, зарыентаваных на дударскую музыку. У Ірландыі праводзяцца фестывалі ірландскай дуды. Альбо вось мы з «Ветахам» наведвалі фестываль дударскай музыкі ў Малай Лігоце (Славакія). Славакія ўнікальная тым, што славацкая дуда — гайда — захавалася там у жывым бытаванні. Туды на фэст з’язджаюцца людзі, якія цікавяцца гэтым інструментам, пераймаюць прыёмы выканання. Даследчык Бернард Гарай, які сам нарадзіўся ў Малой Лігоце, напісаў вельмі сур’ёзную кнігу па гайдзе. Калі ў нас з’явяцца людзі такога ўзроўню і пэўная колькасць аматараў беларускай дуды, тады падобныя фестывалі з’явяцца і ў нас. Магчыма, будуць і фестывалі этнічных спеваў, якія ў нас захаваліся ў жывым бытаванні: фальклорны гурт вёскі Ананьчыцы Салігорскага раёна, «Стаўбонскія вячоркі» Веткаўскага раёна.

Плюс прафесіянальны менеджмент

— Сапраўды, ёсць шмат пытанняў па ўспрыманні сучасным чалавекам музыкі, якая зарыентавана на традыцыйны лад жыцця і традыцыйнае мастацтва. Але тут замкнёнае кола. Калі гэтага мастацтва не будзе ў медыйнай прасторы, мы яго ніколі не палюбім. Традыцыйная культура павінна захоўвацца — дзеля таго, каб захоўваўся этнас. Гэта аксіёма, сучасная навука даказала — калі няма традыцыйнай культуры, фальклору, спеваў, этнічнай музыкі — народ непазбежна загіне і знікне з гістарычнай арэны. А таму першы, хто павінен клапаціцца пра захаванне традыцыйнага мастацтва — гэта дзяржава, якая будзе існаваць, толькі пакуль яе грамадзяне будуць адчуваць сябе асобным народам.

Беларусы ўжо даказалі, што ў іх разуменне важнасці захавання спадчыны ёсць. Яшчэ ў 1990-я гады, калі пачалі з’яўляцца так званыя постфальклорныя калектывы. Калі гараджане бралі народныя інструменты, надзявалі традыцыйныя строі, развучвалі песні і ўсё гэта прапаноўвалі гледачам. Адным з першых калектываў быў гурт «Ліцвіны» Уладзіміра Берберава. Таксама быў спеўны калектыў «Дзянніца». Потым з’явіліся «Госьціца», капэла Алеся Лася. Апошні калектыў займаўся дударскай, смыковай музыкай і дыятанічнымі цымбаламі. Сёння ёсць гурт «Рада». Сярод спевакоў можна назваць Наталлю Матыліцкую, якая выйшла з «Ліцвінаў».

— Безумоўна, без падтрымкі грамадства гэта немагчыма. Як і без істотнай падтрымкі дзяржавы таксама. Таму што каб займацца мастацтвам — трэба мець вольны час і сродкі. Носьбіты традыцыйнай культуры ў свой час забяспечвалі сябе працай на зямлі. Сучасны чалавек мае значна менш вольнага часу на творчасць. Таму, я лічу, будучыня этнічнай музыкі звязана з адукацыйнымі, мастацкімі, даследчыцкімі аспектамі. Насамрэч праблема захавання этнічнай музыкі — даволі сур’ёзная. І ў свеце, і ў Беларусі. Наш геніяльны этнамузыколаг Зінаіда Мажэйка нават выдала кнігу, якая так і называецца — «Экалогія традыцыйнай музычнай культуры». Раскупілі яе імгненна.

Першая прыступка да таго, каб захаваць нашую традыцыйную культуру — трэба захоўваць яе ў структурах паўсядзённасці. Калі з маленства дзіця будзе чуць этнічную музыку ці будзе ездзіць з бацькамі ў вандроўкі, адзначаць традыцыйныя святы, то з часам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у яго сфарміруецца натуральная патрэба ў традыцыйнай культуры, і пасталеўшы, ён міма гэтага ўжо не пройдзе.

Вельмі небяспечна, што мы не маем менеджменту і маркетынгу, якія мэтанакіравана працавалі б на папулярызацыю этнічнай культуры і выводзілі яе на міжнародны ўзровень. Куды знікаюць менеджары культуры? Мы кожны год выпускаем менеджараў, якія, быццам бы, павінны папулярызаваць культуру беларусаў, праводзіць маркетынгавыя даследаванні. Але, напэўна, падчас навучання іх недастаткова паглыбляюць у этнатрадыцыю. Да таго ж у моладзі ўсё адно ёсць жаданне хуткіх грошай, заробку: маўляў, навошта корпацца з этнічнай культурай, калі можна правесці карпаратыў альбо канцэрт танцавальнай музыкі — больш аголенага цела, стразаў, шампанскага і піва — гэта ўсё добра акупляецца. Але будзем шчырымі: усё, што «ніжэй пояса», арганізоўваецца аўтаматычна, таму, што людзі біялагічна на гэта зарыентаваны, а да таго, што звязана з духоўнымі з’явамі, больш складана прыцягнуць увагу.

Ва ўсім свеце тое, што звязана з этнічным мастацтвам, па-іншаму абкладаецца падаткамі, фінансуецца і датуецца. Ёсць пэўная сістэма падатковых зніжак. Калі бізнесмены даюць грошы на развіццё этнічнага мастацтва, ім зніжаюць падаткаабкладанне. А той, хто займаецца традыцыйным мастацтвам на камерцыйнай аснове, мае нейкія падатковыя льготы. Некалі ў Беларусі быў законапраект, які мусіў гэта ўрэгуляваць. Але на пэўным этапе ён забуксаваў. Ці тое дакладна не вызначылі, што лічыць традыцыйным мастацтвам, ці пабаяліся, што будуць злоўжыванні. Пакуль што нашае заканадаўства не гатова стымуляваць традыцыйную культуру.

Дзеці культуры

— Моладзь заўсёды цікавіцца мастацтвам. Сёння кажуць, што моладзь стала больш прагматычная і імкнецца атрымаць выгаду хуткімі спосабамі, але ўсё роўна ва Універсітэт культуры конкурсы даволі высокія. Нават сёлета. Нашая спецыяльнасць — этнафоназнаўства — маладая, набіраем з 2004 года. Але ахвотнікі вучыцца ёсць заўжды. Людзі, якія прыходзяць да нас, належаць да дзвюх катэгорый. Першая — вясковая моладзь, якая пазнаёмілася з мастацтвам сваёй малой радзімы ад бацькоў, бабуль, часткова ў межах праекта «Берагіня» (да нас шмат выпускнікоў гэтага праекта ідзе паступаць). Другая — гарадская моладзь, якая мае да фальклору экзатычны інтарэс, ім гэта цікава на эксперыментальным узроўні. Мы знаёмім іх з этнічнай музыкай беларусаў. Навучанне пабудавана выключна на вусным пераймanні — так, як было ў традыцыйнай культуры. Студэнты ездзяць у фальклорныя экспедыцыі: калі ты не пачуў, як спявае носьбіт традыцыі, пажадана ўжывую, то не зможаш ні імправізаваць, ні пераняць манеру выканання.

У нас кожны курс — калектыў. Сістэма, як ва ўсіх творчых ВНУ, — кіраўнік курса набірае сабе навучэнцаў і вядзе іх да самага заканчэння. Таму што навучанне звязана з вялікім паглыбленнем у традыцыю. І выкладчыкі ў нас цудоўныя: галоўны рэжысёр «Берагіні» Мікола Козенка, Тамара Варфаламеева, Вольга Лабачэўская, Таццяна Пладунова, Эвеліна Шчадрына, Аляксей Рагуля, Энгельс Дарашэвіч.

Самы дэмакратычны інструмент

— Дуда — карэнны інструмент беларусаў. У свой час ён быў самым распаўсюджаным інструментам. Расійскія даследчыкі XIX стагоддзя абсалютна адназначна казалі, што самы галоўны інструмент беларусаў — дуда. Пісьменнік-рамантык Лажэчнікаў у рамане «Ледзяны дом» апісвае сцэну, калі ў Санкт-Пецярбург запрасілі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усёй былой Расійскай імперыі прадстаўнікоў кожнага народа са сваім музычным інструментам. І менавіта беларус надзьмуваў валынку. А Лажэчнікаў гадоў 15, здаецца, быў генерал-губернатарам Віцебска, меў магчымасць добра вывучыць беларускую традыцыйную культуру.

Яшчэ ў XIX стагоддзі дуда вельмі актыўна бытавала, і практычна ўсё жыццё беларуса праходзіла пад яе акампанемент. Так доўжылася да сярэдзіны XX стагоддзя. Дзякуй Богу, за гэты час нашыя навукоўцы паспелі зрабіць замалёўкі беларускай дуды, фотаздымкі, аўдыя- і нават відэазапісы. Ёсць відэазапіс 1939 года, які зафіксаваў выкананне на аўтэнтычнай беларускай дудзе: рэжысёр Кармазінскі зняў дакументальны спецвыпуск, прысвечаны беларускай народнай музыцы. Там каля 30 секундаў аўтэнтычнага выканання на беларускай дудзе. Прычым іграе дуэт дудароў. Гэты відэазапіс знайшоў не так даўно — у 2012 годзе — Канстанцін Рэмішэўскі ў Койданаўскім архіве. Артыкул пра гэта мы напісалі разам з ім. І ён быў надрукаваны ў адным з самых вядомых санкт-пецярбургскіх этнамузыкалагічных часопісаў Musicus. Гэта даволі сенсацыйная знаходка.

У сярэдзіне XX стагоддзя дуда пачала актыўна знікаць. На вёсцы яе выцясняў гармонік, які з’явіўся ў канцы XIX стагоддзя, быў больш гучным і простым у эксплуатацыі. Дударскую традыцыю (карэнную для цэнтральнай і паўночнай Беларусі), якая перапынілася ў сярэдзіне XX стагоддзя, пачалі аднаўляць у 1980-х гадах народныя майстры. Аднымі з першых былі Уладзімір Пузыня і Уладзімір Гром. Потым далучыліся Алесь Лось, Віктар Кульпін, Тодар Кашкурэвіч, Алесь Жура, Дзяніс Сухі. Але, каб цалкам аднавіць культуру выканання на дудзе, выканальніцкую манеру і яе распаўсюджанне ў краіне, трэба наладзіць фабрычную, масавую вытворчасць інструмента. Трэба, каб на дудзе вучылі граць у музычных школах і пра яе распавядалі на ўроках спеваў у сярэдніх школках і садках.

Наколькі я ведаю, у планах Міністэрства культуры гэта ёсць. Толькі так дударская традыцыя пачне спакваля вяртацца на Беларусь. Калі гэта атрымаецца «прабіць», то, сапраўды, дуда можа сыграць вялікую ролю ў захаванні этнічнай музыкі беларусаў і ў музычным развіцці дзяцей і моладзі. Гэта інструмент надзвычай дэмакратычны, на яго ідэальна кладзецца беларуская танцавальная, карагодная і спеўная музыка, якая ў асноўным пад яго і складалася. І ў моладзі ёсць цікавасць да гэтага інструмента. Нават у тым жа рэканструктарскім руху. Моладзь бачыць нейкія перакрыжаванні з еўрапейскай культурай, і ёй гэта падабаецца. Так можна прывабіць да народнага мастацтва людзей, якія на першы погляд абсалютна далёкія ад яго: карэнных гараджан, якія, можа, і на вёсцы ніколі не былі. Тым не менш яны праяўляць да гэтага цікавасць. Гэта вельмі каштоўна.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ